## 2019 — Год малой радзімы

# Малая радзіма знакамітых людзей

***К. Д. Варанько,***
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

**Многія мясціны, былыя ўладанні, маёнткі, з якімі звязаны лёс знакамітых дзяржаўных дзеячаў, вучоных, гісторыкаў, пісьменнікаў, мастакоў, набылі шырокую вядомасць. Сядзібы — ад магнацкіх рэпрэзентатыўных замкаў і палацаў да дробнапамесных шляхецкіх фальваркаў — займаюць значнае месца ў гісторыі беларускай культуры. Дасягненні знакамітых гаспадароў, іх уклад у культурнае асяроддзе канкрэтнай мясцовасці прадстаўляюць сабой вялікую каштоўнасць. У радавых маёнтках канцэнтраваліся багатыя калекцыі па гісторыі краю, прыроды, мастацтва, літаратуры (уласныя зборы Радзівілаў, Сапег, Румянцавых, Паскевічаў, Хадкевічаў, Астрожскіх, Солтанаў, Друцкіх-Любецкіх, Чапскіх, Тышкевічаў, І. Храптовіча, Г. Ябланоўскай, К. Тызенгаўза, Т. Нарбута і інш.).**

Аднаўленне былых ансамбляў і сядзіб, якія маюць вялікае культурна-гістарычнае значэнне, з'яўляецца высакароднай справай дзяржавы. Вяртанне былой велічы важным аб'ектам і тэрыторыям часта ўскладнена тым, што аб іх існаванні нагадваюць толькі руіны, рэшткі паркаў, інвентары, малюнкі. Гэта патрабуе дасканалага навуковага вывучэння, аднаўлення, трансляцыі і папулярызацыі. Амаль усе замкі, палацы і шляхецкія сядзібы, якія будаваліся на працягу XVI — пачатку XX стагоддзя, сталі дзяржаўнай маёмасцю. Месца некаторых такіх аб'ектаў займаюць розныя ўстановы, іншыя знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, другія выкарыстоўваюцца ў якасці музеяў. Менавіта музеефікацыя дазваляе захаваць гісторыка-культурную, навуковую, мастацкую каштоўнасць помнікаў для будучых пакаленняў. Пры гэтым рашаецца важная задача іх сучаснага выкарыстання, уключэння ў жыццё грамадства. Многія сядзібы і паркі ўваходзяць у экскурсійныя праграмы. Сярод музеяў, якія ўзніклі на радзіме знакамітых людзей, асабліва шмат літаратурных — Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча «Кушляны» (в. Кушляны Смаргонскага раёна); Дом-музей Петруся Броўкі (в. Пуцілкавічы Ушацкага раёна); Сядзіба-музей В. Быкава (в. Бычкі Ушацкага раёна); Літаратурны музей імя М. Гарэцкага (в. Багацькаўка Мсціслаўскага раёна); Аршанскі музей У. С. Караткевіча; «Мікалаеўшчына», філіял Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа (г. Стаўбцы; уключае літаратурна-мемарыяльны комплекс Смольня, сядзібы Акінчыцы, Альбуць, Ласток); «Вязынка», філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (в. Вязынка Маладзечанскага раёна); Літаратурны музей Кузьмы Чорнага (в. Цімкавічы Капыльскага раёна) і інш. Размяшчаліся сядзібы ў жывапіснай мясцовасці і адрозніваліся выразнасцю архітэктурнага рашэння не



**Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча «Кушляны» (в. Кушляны Смаргонскага раёна)**

толькі сядзібнага дома, але і гаспадарчых пабудоў, радавых капліц і інш. У іх склад часам уваходзілі паркі з кветнікамі, аранжарэямі, малымі архітэктурнымі формамі, воднымі сістэмамі. Нярэдка сядзібы, развітыя гаспадарчыя комплексы, узорныя гаспадаркі былі прыкметнай культурна-эканамічнай з'явай краю. На іх базе ўзнікалі радавыя маёнткі, створаныя многімі пакаленнямі. Сядзібы найбольш багатых уладароў былі вядомы не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе, яны прадстаўлялі сабой велічныя ансамблі, архітэктура, жывапіс, скульптура і садова-паркавае мастацтва якіх вылучаліся асаблівым характвом (Нясвіж, Альба, Слонім, Ружаны, Бачэйкава і інш.). У канцы XIX — пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі Беларусі было больш за 8000 розных сядзіб і маёнткаў, у цяперашні час засталося каля 1200. З іх па 831-й маюцца задакументаваныя звесткі. На думку аўтарытэтнага беларускага даследчыка сядзібнай спадчыны А. Федарука, адным з лідзіруючых рэгіёнаў Беларусі па ступені захаванасці сядзіб, якія дэманструюць разнастайнасць стыляў і форм, з'яўляецца Гродзенская вобласць. Значэнне захавання сядзібна-ландшафтных комплексаў падкрэслена заканадаўствам краіны — Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры (глава 16, артыкул 82). Пры рэвалярызацыі помнікаў, архітэктурных ансамбляў і славутых мясцін, якія маюць вялікую гістарычную або эстэтычную каштоўнасць, важна прадставіць гістарычны выгляд аб'ектаў, прасачыць асноўныя этапы іх развіцця, адлюстраваць вобразы найбольш вядомых яе жыхароў, паказаць іх жыццё і дзейнасць, звязаныя з канкрэтнай мясцінай. У справе аднаўлення старадаўніх беларускіх сядзіб разам з арганізацыямі

> Менавіта музеефікацыя дазваляе захаваць гісторыка-культурную, навуковую, мастацкую каштоўнасць помнікаў для будучых пакаленняў. Пры гэтым рашаецца важная задача іх сучаснага выкарыстання, уключэння ў жыццё грамадства.

Беларусі і іншых краін актыўна ўдзельнічаюць гісторыкі, мастацтвазнаўцы, краязнаўцы, асобныя зацікаўленыя любіцелі даўніны. Значных поспехаў дасягнулі добраахвотныя фонды. Так, напрыклад, фонд «Паўночныя Афіны» атрымаў грант на адраджэнне сядзібы М. Агінскага ў Залессі, і да 250-гадовага юбілею кампазітара яе рэканструкцыя была праведзена; дзякуючы намаганням добраахвотнага фонду імя Я. Наркевіча-Ёдкі ідуць работы па рэканструкцыі радавой сядзібы вучонага ў Над-Нёмане і інш. Тэрыторыя, ахопленая музеефікацыяй, мае тэндэнцыю да пашырэння. У гэты працэс могуць быць уключаны найбліжэйшыя вёскі, навакольны ландшафт, якія непасрэдна звязаны з сядзібай.

> Нярэдка сядзібы, развітыя гаспадарчыя комплексы, узорныя гаспадаркі былі прыкметнай культурна-эканамічнай з'явай краю. На іх базе ўзнікалі радавыя маёнткі, створаныя многімі пакаленнямі. Сядзібы найбольш багатых уладароў былі вядомы не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе, яны прадстаўлялі сабой велічныя ансамблі, архітэктура, жывапіс, скульптура і садова-паркавае мастацтва якіх вылучаліся асаблівым хараством.

У апошнія гады ў Беларусі належным чынам ушаноўваюцца імёны славутых і таленавітых асоб, устаноўлена шмат мемарыяльных знакаў. Некаторыя сядзібы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю знакамітых людзей, унесены ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца пад аховай дзяржавы. Па розных абставінах многія вядомыя палітычныя дзеячы, вучоныя, гісторыкі, пісьменнікі, мастакі пакідалі свае гістарычныя землі, працягваючы жыць у іншых краінах, уносіць уклад



**Дом-музей Петруся Броўкі (в. Пуцілкавічы Ушацкага раёна)**



**Інтэр'ер Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага (в. Цімкавічы Капыльскага раёна)**

у іх развіццё. Справы і заслугі гэтых людзей настолькі значныя, што створаныя імі культурныя каштоўнасці ўвайшлі ў залаты фонд еўрапейскай і сусветнай культуры. Імёны некаторых з іх па праве належаць многім народам. З беларускімі землямі звязаны лёс Т. Касцюшкі, М. Агінскага, А. Міцкевіча, Н. Орды.

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2019, № 4), які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны бібліяграфічны спіс «Малая радзіма знакамітых людзей» (складальнік Т. І. Лагош). Ён уключае наступныя раздзелы: «Родныя мясціны Тадэвуша Касцюшкі (1746—1817), палітычнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай (Мерачоўшчына Малыя Сяхновічы )», «Залессе ў жыцці Міхала Клеафаса Агінскага (1765—1833), дзяржаўнага дзеяча, кампазітара», «Падарожжа па родных мясцінах Адама Міцкевіча (1798—1855), паэта, публіцыста», «Варацэвічы — спадчынны маёнтак Напалеона Орды (1807—1883), мастака, піяніста, кампазітара, педагога».

Пры рэвалярызацыі помнікаў, архітэктурных ансамбляў і славутых мясцін, якія маюць вялікую гістарычную або эстэтычную каштоўнасць, важна прадставіць гістарычны выгляд аб'ектаў, прасачыць асноўныя этапы іх развіцця, адлюстраваць вобразы найбольш вядомых яе жыхароў, паказаць іх жыццё і дзейнасць, звязаныя з канкрэтнай мясцінай.

Інфармацыя, прадстаўленая ў бібліяграфічным спісе, будзе карысна бібліятэкарам, гісторыкам, этнографам, краязнаўцам, аматарам музеялогіі, усім, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі.

*У артыкуле выкарыстаны фотаздымкі з сайта https://be.wikipedia.org/*